УДК 81’373.21 (476.7)

В.М. Босак, праф., д-р с.-г. навук (БДСГА, г. Горкі);
А.А. Босак, дац., канд. філ. навук (БДЭУ, г. Мінск)

# ТАПОНІМ “САСНОВАЯ ІГЛІЦА” Ў ГАВОРКАХ ВЕРХНЯГА НАД’ЯСЕЛЬДЗЯ

На тэрыторыі Верхняга Над’ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) вылучана сем адмысловых гаворак, якія маюць адметныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці [1–19].

Даследаванне па вызначэнню лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над’ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) праводзілася ў форме апытвання па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключала 102 пытанні па лексіцы, у тым ліку па некалькіх тэматычных групах “лясной тапанімікі” [4].

У тэматычнай групе ‘лес’ значную цікавасць выклікае тапонім ‘сасновая ігліца’ [4, 7, 11, 15].

Для абазначэння ‘сасновай ігліцы’ ўжываюцца фанетычныя, лексічныя і словаўтваральныя варыянты: *бóд$^з$яхі* /*бóдэха*, *бóдаха*, *бýдаха*, *бодкí*, *боддзé*/, *кастрыцá*, *шыкатá* /*шыкотá*, *шыпотá*/, *шэбодá* /*шыбудá*/, *шыпка* /*шыпша*/, *шыпчóха* /*шыпшóха*/, *шпілюхí* /*шпілюшчэ*, *шпілюш’é*/, *скулíна* . Лексема *кастрыцá* ўласціва гаворкам поўначы даследуемага рэгіёна (малюнак).




**Малюнак**

Назва *бóд³яхі* /*бóдэха*, *бóдаха*, *бýдаха*, *бодкí*, *боддзé*/ характэрна для цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частак Верхняга Над’ясельдзя.

Найменне *шыкатá* /*шыкотá*, *шыпотá*/ ўласціва гаворкам заходняй і сустракаецца спарадычна ў цэнтральнай частцы даследуемага рэгіёна. Намінацыя шыпка /*шыпша*/ ўжываецца ў гаворках паўднёвага захаду Верхняга Над’ясельдзя, сустракаецца яна і ў некаторых гаворках цэнтральнай часткі рэгіёна. Лексема *шыпчóха* /*шыпшóха*/ ўтварае невялікі арэал у цэнтральных дыялектах.

Назвы шэбодá /шыбудá/, шпілюхí /шпілюшчэ, шпілюш’é/ ўжываюцца спарадычна ў гаворках асобных населеных пунктаў даследуемага рэгіёна. Лексема *скулíна* занатавана ў гаворцы в. Калазубы Пружанскага раёна.

Такім чынам, даследуемы тапонім ‘сасновая ігліца’ прадстаўлены разнастайнымі дыялектнымі формамі; у складзе намінацый адзначаны фанетычныя, лексічныя і словаўтваральныя варыянты.

ЛІТАРАТУРА

1. Босак, А. Гаворкі Верхняга Над’ясельдзя (Nářeční horního Nadjaseldí) / А. Босак, В. Босак // České vědomí Bělarusi. – Praha: Karolinum, 2013. – P. 117–122.

2. Босак, А. Некаторыя асаблівасці стварэння атласа гаворак Верхняга Над’ясельдзя / А. Босак, В. Босак // Діалектна мова: сучасний стан і динаміка в часі. – Київ, 2008. – С. 40–42.

3. Босак, А.А. Адметныя асаблівасці гаворак Верхняга Над’ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Устойчивое развитие экономики: состояние, проблемы, перспективы. – Пинск: ПолесГУ, 2008. – С. 169–170.

4. Босак, А.А. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над’ясельдзя). Лексіка / А.А. Босак, В.М. Босак. – Мінск, 2006. – 124 с.

5. Босак, А.А. Бульба ў гаворках Верхняга Над’ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы. – Гомель: ГГТУ, 2009. – С. 264–266.

6. Босак, А.А. Гаворкі Верхняга Над’ясельдзя на дыялектнай мапе Брэсцка-Пінскага Палесся / А.А. Босак, В.М. Босак // Прыроднае асяроддзе Палесся: асаблівасці і перспектывы развіцця. – Брэст: Акадэмія, 2006. – Т. ІІ. – С. 522–525.

7. Босак, А.А. Дыферэнцыяцыя і арэальныя сувязі гаворак Верхняга Над’ясельдзя: аўтарэферат дысертацыі кандыдата

філалагічных навук: 10.02.01 / А.А. Босак. – Мінск: Інстытут мовазнаўства НАН Беларусі, 2006. – 20 с.

8. Босак, А.А. Лінгвагеаграфічнае даследаванне лексікі гаворак Верхняга Над’ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Природная среда Полесья: особенности и перспективы развития. – Брест: Альтернатива, 2010. – С. 135.

9. Босак, А.А. Нюра / А.А. Босак // Народныя скарбы: дыялекталагічны зборнік. – Мінск, 2008. – С. 253–254.

10. Босак, А.А. Фанетычныя асаблівасці гаворак Верхняга Над’ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Веснік Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя грамадскіх і гуманітарных навук. – 2009. – № 1. – С. 74–79.

11. Босак, В.М. “Лясная тапаніміка” ў гаворках Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Труды БГТУ: История, философия, филология. – 2015. – № 5. – С. 178–182.

12. Босак, В.М. Асаблівасці інавацыйных з’яў у гаворках Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак, Ф.Д. Клімчук // Труды БГТУ: История, философия, филология. – 2014. – № 5. – С. 145–147.

13. Босак, В.М. Гаворкі Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Вестник БГСХА. – 2020. – № 3. – С. 255–258.

14. Босак, В.М. З лексікі роднай вёскі (вёска Смаляніца Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці) / В.М. Босак, А.А. Босак // Народныя скарбы. – Мінск, 2008. – С. 31–32.

15. Босак, В.М. Лінгвагеаграфічнае даследаванне лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Труды БГТУ. Серия 4: Принт- и медиатехнологии. – 2017. – № 1. – С. 91–95.

16. Босак, В.М. Назвы адзення ў гаворках Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Труды БГТУ: История, философия, филология. – 2016. – № 5. – С. 195–197.

17. Босак, В.М. Назвы насякомых у гаворках Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2021. – С. 106–107.

18. Босак, В.М. Назвы свойскіх і дзікіх птушак у гаворках Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2022. – С. 130–131.

19. Босак, В.Н. Говоры Верхнего Надъясельдья / В.Н. Босак, А.А. Босак // Филология. –2018. – № 1. – С. 34–36.